УДК 378

# САМААДУКАЦЫЯ ЯК КРЫНІЦА ПРАФЕСІЙНАГА РОСТУ ПЕДАГОГА

**Багдановіч Алена Валер'еўна**

намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце
дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва"
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

**Анатацыя.** У аснове самаадукацыі ляжаць якасці самога педагога, яго непасрэдныя інтарэсы, якія выбудоўваюцца ў залежнасці ад запатрабаванняў – як сацыяльных, так і культурных.

**Ключавыя словы:** самаадукацыя, формы самаадукацыі, педагагічная адукацыя.

Патрэбы грамадства, якія пастаянна змяняюцца, ставяць сучаснага педагога ва ўмовы бесперапыннай адукацыі. Таму актуалізуецца задача станаўлення педагагічных кампетэнцый у настаўніка, што садзейнічае фарміраванню педагога новай фармацыі, які адпавядае ўсім сучасным патрабаванням. Асноўны крытэрый якаснай адукацыі – прафесіяналізм педагагічных кадраў. У сучасных умовах развіцця адукацыі адной з крыніц прафесійнага росту педагога становіцца самаадукацыя.

В. А. Сухамлінскі аддаваў перавагу самаадукацыі перад іншымі формамі метадычнай працы. Ён пісаў: "Веды, здабытыя самаадукацыяй, вельмі цвёрда захоўваюцца ў памяці. Падчас самаадукацыі фарміруюцца індывідуальныя рысы асобы, выпрацоўваецца індывідуальны стыль разумовай працы" [2, с. 143]. Самаадукацыяй лічыцца працэс самастойнай і ўсвядомленай пазнавальнай дзейнасці, накіраваны на набыццё сістэмных ведаў. У аснове гэтай дзейнасці ляжаць якасці самога педагога, яго непасрэдныя інтарэсы, якія выбудоўваюцца ў залежнасці ад запатрабаванняў – як сацыяльных, так і культурных. Урэшце самаадукацыя з'яўляецца адным з асноўных спосабаў самавыхавання асобы. Найбольш важнай формай самаадукацыі з'яўляецца перш за ўсё азнаямленне з навучальнай, навукова-папулярнай, мастацкай літаратурай.

Не менш важнымі крыніцамі самаадукацыі з'яўляюцца таксама ўдзел у канферэнцыях, праслухоўванне лекцый, семінараў, дакладаў, вебінараў. Задача самаадукацыі – заўсёды павышаць адукацыйны ўзровень, раскрываць творчыя здольнасці чалавека. "Найважнейшымі прынцыпамі самаадукацыі лічацца: індывідуальная праца настаўніка з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі; крытычнасць мыслення, якая дазваляе аналізаваць атрыманую інфармацыю; бесперапыннасць, якая спрыяе заставацца актуальным у існуючым прафесійным

асяроддзі; узаемасувязь адукацыі з творчым пошукам; інтэгратыўнасць, якая дазваляе развіваць творчы патэнцыял педагога” [2, с. 145].

Настаўнік мае права сам арганізоўваць самаадукацыйную дзейнасць. Разам з тым адукацыйная ўстанова можа выступаць ініцыятарам і прапанаваць сваю сістэму самаадукацыйнай дзейнасці для настаўніка. Сістэма павінна ўключаць у сябе такія аспекты, як: бягучае і перспектыўнае планаванне; выбар зручных форм і метадаў засваення і захоўвання інфармацыі; рэгулярнае асваенне новых метадаў даследчай дзейнасці; сістэматычнае павышэнне ўзроўню кваліфікацыі кожнага педагога; выкарыстанне розных метадаў аналізу пры абагульненні педагагічнага досведу. “Многія педагогі, зыходзячы з вопыту сваёй работы, вылучаюць наступныя формы самаадукацыі:

• рэпрадуктыўныя (практыкумы, навукова-практычныя семінары, педагагічныя майстэрні, семінары-практыкумы, трэнінгі);

• рэпрадуктыўна-эўрыстычныя (педагагічныя чытанні, навукова-практычныя канферэнцыі);

• эўрыстычныя (праблемныя і праблемна-праектныя семінары, арганізацыйна-дзейнасныя гульні);

• эўрыстыка-прадуктыўныя (фестывалі педагагічных ідэй, конкурсы прафесійнага майстэрства, конкурсы метадычных распрацовак);

• прадуктыўныя (навуковыя канферэнцыі, тэарэтычныя семінары, навуковыя стажыроўкі, удзел у рабоце часовых навукова-даследчых калектываў, часовых творчых груп)” [1, с. 38].

Пры захаванні мэтанакіраваных, планамерных і сістэматычных дзеянняў самаадукацыя дасягне пазітыўных вынікаў. Для гэтага неабходна скласці план прафесійнага развіцця педагога, пры распрацоўцы якога трэба звярнуць увагу на наступныя пункты: псіхолага-педагагічная падрыхтоўка; прафесійная падрыхтоўка; індывідуальная творчая падрыхтоўка; практычныя заняткі.

Мэтай самаадукацыі для кожнага педагога павінен быць пэўны прадукт ці якія-небудзь дасягненні. Так, вынікамі самаадукацыі могуць быць:

• высокая якасць працы, якая праводзіцца з дзецьмі; стварэнне дапаможнікаў, працоўных сшыткаў па выкладаемым прадмеце, сцэнарыяў мерапрыемстваў і інш.; даклады, выступленні;

• распрацоўка дыягнастычных матэрыялаў, нагляднасці; правядзенне адкрытых навучальных заняткаў па ўласных тэхналогіях;

• падрыхтоўка вебінараў, майстар-класаў.

Для кожнага педагога карысна спланаваць меркаваныя вынікі. Гэта могуць быць:

• распрацоўка сцэнарыяў; удзел у канферэнцыях рознага ўзроўню, пачынаючы ад агульнаадукацыйнай установы і заканчваючы міжнародным узроўнем; стварэнне для сябе новых арганізацыйных форм і метадаў працы; распрацоўка адукацыйнай праграмы; правядзенне трэнінгаў, семінараў, канферэнцый, майстар-класаў;

• абагульненне вопыту па навучальнай праблеме; стварэнне розных метадычных дапаможнікаў, электронных дапаможнікаў, аб’яднаных адной прадметнай тэматыкай, дыдактычных матэрыялаў;

• распрацоўка кантрольна-вымяральных матэрыялаў;

• стварэнне каляндарна-тэматычнага планавання; стварэнне банка даных гульняў, загадак, вершаў; распрацоўка тэматычных класных гадзін; арганізацыя гуртка па выкладаемай дысцыпліне; удзел у метадычных аб'яднаннях; складанне базы даных метадычнай літаратуры і публікацыі па тэме самаадукацыі; стварэнне асабістага метадычнага сайта;

• стварэнне базы псіхолага-педагагічных матэрыялаў для класных кіраўнікоў.

У сучаснай сістэме адукацыі кожны педагог павінен ажыццяўляць дэталёвы аналіз сваёй прафесійнай работы і самастойная работа па самаадукацыі дае магчымасць авалодаць элементарнай дыягнастычнай і даследчай дзейнасцю. Сістэматычная работа накіравана на развіццё пазнавальнай дзейнасці ў выкладчыка, садзейнічае пастаяннай патрэбнасці ў папаўненні ведаў, дае магчымасць сфарміраваць гнуткае мысленне і прагназаваць выхаваўча-адукацыйны працэс [1].

Самаадукацыйны працэс дапамагае раскрыць творчы патэнцыял педагога, а таксама здольнасць ажыццяўляць праблемны аналіз, які дазваляе педагогу аб'ектыўна ацэньваць свае добрыя якасці і недахопы і на аснове гэтых дадзеных мадэляваць педагагічную дзейнасць і дасягаць вызначаных вынікаў. Настаўнік, які мае навыкі самастойнай працы, можа перайсці да мэтанакіраванай навукова-практычнай, даследчай дзейнасці, што сведчыць аб больш высокай прафесійнай кампетэнцыі педагога.

## Спіс літаратуры

1. Карпава, Н. Л. Фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці педагога праз самаадукацыю / Н. Л. Карпава. – М., 2014. – 34 с.

2. Юденко, Т. А. В. А. Сухомлинский о самообразовании и работе с книгой / Т. А. Юденко // Известия РГПУ имени А. И. Герцена. Аспирантские тетради.– СПб., 2007. – № 8 (27). – С. 143–147.